# ЛИТЕРАТУРОВЕДЕНИЕ

**УДК [821. 161.3-31.09+821.174-31.09](476.5)**

## ПОЛАЦК І ПОЛАЧЧЫНА XIII СТАГОДДЗЯ Ў ТВОРАХ Я. НІЕДРЭ І БЕЛАРУСКІХ ПРАЗАІКАЎ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XX СТАГОДДЗЯ

***д-р філал. навук, дац. В.Ю. БАРОЎКА***
***(Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава)***

*Аналізуецца мастацкае адлюстраванне Полацка і Полаччыны XIII стагоддзя ў творах латвійскага аўтара Я. Ніедрэ і беларускіх празаікаў другой паловы XX стагоддзя У. Арлова і Л. Дайнекі. Сцвярджаецца, што зварот пісьменнікаў да эстэтычнага ўзнаўлення мінулага дэтэрмінаваўся значнай роллю Полацка ў тагачаснай еўрапейскай гісторыі, а таксама асабістай зацікаўленасцю аўтараў. Падкрэсліваецца, што празаікі другой паловы XX стагоддзя стварылі свой полацкі тэкст. Для Я. Ніедрэ Полацк – асяродак барацьбы з крыжакамі, цэнтр культуры; для беларускіх пісьменнікаў У. Арлова і Л. Дайнекі – гэта уплывовы палітычны, гандлёвы, культурны цэнтр на славянскіх землях, горад са своеасаблівай архітэктурай, феадальна-рамесніцкай дэмакратыяй, рэлігійнай талерантнасцю жыхароў.*

**Уводзіны.** Літаратурны твор – сродак рэпрэзентацыі і мадэлявання пэўнай рэчаіснасці. Кожная нацыянальная літаратура стварае свой гарадскі ці пэўны рэгіянальны тэкст, гэта значыць, свой вобраз канкрэтнай тэрыторыі. Хоць беларускае слоўнае мастацтва на працягу двух апошніх стагоддзяў галоўным чынам вылучалася "вясковай" тапаграфіяй, аднак у ім наглядаліся спробы прадставіць вобраз беларускага горада, увасабленнем якога найперш выступалі Вільня, Полацк і Мінск. Сучаснае літаратуразнаўства мае значныя напрацоўкі ў даследаванні, напрыклад, лонданскага, парыжскага, пецярбургскага, маскоўскага тэкстаў. У айчыннай навуцы пра літаратуру толькі фарміруецца традыцыя навуковага даследавання гарадскога тэксту. Фрагментарныя спробы вывучэння віленскага і мінскага тэкстаў рабіліся пакуль асобнымі, пераважна маладымі беларускімі літаратуразнаўцамі. Думаецца, ёсць неабходнасць у грунтоўным, канцэптуальна-сістэмным даследаванні полацкага тэксту на матэрыяле твораў як айчынных, так і замежных аўтараў, бо старажытны Полацк – калыска беларускай дзяржаўнасці, прызнаны цэнтр процістаяння крыжацкай навале ў XIII стагоддзі.

**Асноўная частка.** Гераічныя і трагічныя моманты гісторыі звычайна найперш прыцягваюць увагу пісьменнікаў, таму Полацк і Полаччына перыяду Сярэднявечча на працягу мінулага стагоддзя дастаткова часта станавіліся прадметам мастацкага ўвасаблення ў творах беларускіх і іншанацыянальных пісьменнікаў. Полаччына як стратэгічна важнае ў палітычных адносінах памежжа беларускіх і латышскіх зямель у перыяд Сярэднявечча паказана ў рамане латышскага пісьменніка Яніса Ніедрэ "І вецер гуляе на пажарышчы..." (1977). У творы шмат ускосна апавядалася пра лёс князя Герцыке Усевалада Рагвалодавіча, васала Полацкага князя. Усевалад, або на латышскі лад Вісвалд, згодна з гістарычнымі крыніцамі, мужна змагаўся з крыжакамі і загінуў пры надзвычай загадкавых абставінах. Раман Я. Ніедрэ – мастацкая інтэрпрэтацыя драматычнай барацьбы латгалаў з крыжакамі. Галоўны герой гэтага твора – паповіч Юргіс, за красамоўства празваны Златавустам. У самым пачатку рамана празаік заўважае, што латгалы нядрэнна ведалі мову крывічоў, час ад часу ў сваю гутарку ўключалі крывіцкія словы, што сведчыла пра трывалыя сувязі насельніцтва дзвюх памежных зямель. Паводле аўтара, латгалы разлічвалі на дапамогу полацкага князя ў сваім процістаянні крыжакам. Тэўтоны баяліся, "каб дружыны полацкага князя не рушылі ў вусце Даўгавы, не спалілі ўзведзеныя ордэнаўцамі ўмацаванні, каб не захрумсцелі шыі рыцараў чорнага крыжа ў петлях шыбеніц" [3, с. 34]. Адзін з персанажаў рамана, Паіке, чалавек сталага веку, марыў вярнуцца дадому з полацкай дружынай, пад крыжамі рускіх сцягоў з выявай святога Георгія і выгнаць тэўтонаў. Аднак смерць Вісвалда перакрэсліла гэтыя планы, "паплыў уладар Герцыке ў ладдзі духаў". Малады Юргіс сцвярджаў, што Вісвалд не загінуў, бо ніхто не бачыў князя мёртвым. Юргіс пераконваў суайчыннікаў, што чуткі пра смерць князя пусцілі тыя, хто пайшоў на змову з чужынцамі. Надоўга трапіў у Полацкую зямлю малады латгал Міклас, калі ратаваўся ад немцаў, якія чынілі пераследы "латгальскім вотчыннікам, што збіралі даніну князю полацкаму збожжам, воскам, футрам, жалезным таварам, тканінамі і ўпрыгожаннямі" [1, с. 128].

Аповед пра важнейшыя гістарычныя падзеі першай трэці XIII стагоддзя ў рамане Я. Ніедрэ суб'ектывізаваны, пра іх расказваюць самі персанажы. Героі твора згадваюць, у прыватнасці, пра тое, як каталіцкі епіскап атрымаў ад полацкага князя дазвол прапаведваць на ўзбярэжжы Даўгавы вучэнне Хрыста-Выратавальніка і Прысвятой Дзевы; пра падрыхтоўку паходу полацкага князя Уладзіміра сумесна з дружы-

най Герцыке і з літоўцамі на тэўтонаў у вусце Даўгавы. Гэты паход не адбыўся, бо смаленскі князь стаў варагаваць з ліцвінамі, а таму Вісвалд не асмеліўся ваяваць без падтрымкі Полацка. На старонках рамана таксама згадваўся лёс васала полацкага ўладара кокнескага (кукейнаскага ў беларускіх крыніцах – *В. Б.*) князя Вячкі, вымушанага крыжакамі пакінуць свае ўладанні і шукаць прытулку ў Пскове. Значнае месца адводзілася ў рамане аповеду пра процістаянне крыжакоў і князя Герцыке Вісвалда, пра ўварванні і спаленне крыжакамі гэтага самага вялікага ў XIII стагоддзі горада на Даўгаве, пра паланенне жонкі Вісвалда і нявыгадную для герцыкскага князя дамову з рыжскім епіскапам Альбертам, пра падтрымку Полацкім княствам барацьбы латгалаў з крыжакамі.

Полацк найперш паказваецца вачамі галоўнага героя рамана Я. Ніедрэ Юргіса, што нарадзіўся ў сям'і праваслаўнага святара. У юным узросце Юргіса адправілі вучыцца ў Полацк. Горад уразіў хлопца: "Але вось сын герцыкскага святара ўбачыў Полацк – і панік, як птушаня на марозе. Божа, якая моц! Нябачаная да гэтага часу колькасць драўляных і каменных будынкаў, праходы паміж імі засланыя дошкамі, а колькі людзей, рамесных і гандлёвых! А цэрквы! Белыя, як пена на парогах Даўгавы, з круглымі купаламі, сінімі і залатымі, з бліскучымі і накіраванымі ў неба званніцамі!" [1, с. 130]. Знаёмства з Полацкам у дзяцінстве стала для Юргіса адкрыццём іншага свету: "Яшчэ даведаўся Юргіс у манастыры, што ў спецыяльных сховішчах полацкага скрыпторыя змешчаны прывезеныя з далёкіх зямель высечаныя з каменя і ўпрыгожаныя каштоўнымі камянямі багі і героі – барадатыя і маладыя, усе як жывыя з аблічча. А ў княскай скарбніцы – чужаземныя кубкі з золата і серабра і шыкоўныя вазы з залатымі птушкамі, якія спяваюць. І цудоўныя дудкі, і кокле, якія маюць такое прыгожае гучанне, што той, хто яго чуе, як бы пазбауляецца розуму. І што ў полацкіх знатных і гандлёвых людзей ёсць мноства сярэбраных і бронзавых кругляшоў, на якіх змешчаны выявы грозных барадатых людзей, і каштоўнасць гэтых кругляшоў такая ж, як у крывіцкіх, літоўскіх ці латгальскіх грошай, сярэбраных грывен і абручоў" [1, с. 132].

У паказе Ніедрэ Полацк – вялікі культурны, асветніцкі і гандлёвы цэнтр. Латышскі пісьменнік адзначаў, што латгалы і крывічы ў асноўным прытрымліваліся праваслаўнай веры, полацкіх святых латгалы ўспрымалі як сваіх святых, а хрысціянскае веравызнанне дастаткова мірна ўжывалася з ранейшымі язычніцкімі ўяўленнямі і звычаямі. Гэта талерантны горад: "У Полацку даводзілася Юргісу сустракаць уцекачоў з іншых княстваў, з іншых манаскіх абшчын, і чуў ён ад іх страшныя аповеды пра міжусобіцы паміж паслядоўнікамі розных цэркваў" [2, с. 21]. У многім талерантнай была і залежная ад Полацка Герцыке: "У Герцыке да яе разбурэння мірна суіснавалі і святары з Пскова і Полацка, і лацінскія прапаведнікі" [2, с. 25]. Полацк і Полаччына давалі прытулак людзям, якім пагражала смяротная небяспека. Калі Юргіс не змог падняць запалоханых рыцарамі землякоў на барацьбу, то зноў накіраваўся ў Полацк, стаў там манахам. Ён перапісваў царкоўныя кнігі і адначасова, хаваючыся ад настаяцеля манастыра Сімяёна Наўгародца, пісаў гісторыю свайго часу і сваёй зямлі, дзе выказваў сваю ўдзячнасць гасціннаму Полацку.

Яніс Ніедрэ падкрэсліваў у "Пасляслоўі", што яго раман угрунтаваны на моцнай факталагічнай аснове: "гістарычна дакументаваныя цесныя сувязі Герцыке з Полацкім княствам"; "гістарычная асоба і сын праваслаўнага святара ў Герцыке Юргіс, які займаўся перапісваннем кніг у бібліятэцы Полацкага манастыра" [3, с. 74].

Полацк XIII стагоддзя па-мастацку ўзноўлены таксама ў творах беларускіх празаікаў другой паловы XX стагоддзя: у аповесці "Дзень, калі ўпала страла" (1985) Уладзіміра Арлова, у рамане "Меч князя Вячкі" (1987) Леаніда Дайнекі. У цэнтры твора У. Арлова "Дзень, калі ўпала страла" – полацкі князь Уладзімір, або Валодша, – дальнабачны правіцель, заклапочаны абаронай роднай зямлі ад крыжакоў. Як бы паміж іншым ва ўспамінах Валодшы згадваліся падуладныя Полацку Герцыке і яго князь Усевалад. Полацк у творы Арлова паэтызуецца. Гэта багаты горад, які славіцца рамёствамі, феадальна-рамесніцкай дэмакратыяй, цэрквамі і манастырамі. Полацкае веча, прадстаўленае баярамі, купцамі, рамеснікамі, было адносна аўтаномным, яно вырашала многія пытанні дзяржаўнага характару, у тым ліку і лёс князя-правіцеля. Адным са сведчанняў магутнасці горада і княства былі багатыя цэрквы і манастыры. Князь Валодша ў аповесці любіць слухаць званы: "Шматгалосая размова званоў нараджае ў душы князя дзіўнае пачуццё, у якім спакойная вера, што гэты крывіцкі горад будзе стаяць над Дзвіною давеку, сплёталіся з адчуваннем незвычайнай дужасці, з юначым жаданнем зліцца з канём і імчаць па далёкіх дарогах, чуць вецер у вушах, спаць адным вокам каля лясных вогнішчаў" [4, с. 243]. Як і Яніс Ніедрэ, Уладзімір Арлоў падкрэслівае талерантнасць горада: "Полацку здавён не надта рупіла, што яго даннікі моляцца не ў цэрквах, а ў гаях і дубровах, іхнія багі любілі мяса аленяў і тураў, а найлепшым пачастункам была ім кроў палонных чужынцаў" [4, с. 253]. Полацк у мастацкім ўзнаўленні празаіка – прызнаны асяродак барацьбы са знешняй навалай, а гэта прымушала людзей змалку вучыцца вайсковай справе. Не выпадкова князь Валодша нязменна паўтараў сыну: "Такі ўжо ў князёў крывіцкіх няпісаны закон: у тры гады сына на каня садзіць, у сем аддаваць у навучанне грамаце, а як міне дванаццаць – можна княжыча і на вайну браць" [4, с. 247].

Полацк паказаны ў рамане буйным гандлёвым горадам, а рамесніцтва і купецтва – моцнай апорай княскай улады. Полацкія купцы мелі гандаль з Брэменам, Любекам і іншымі гарадамі Заходняй Еўропы, Полацк абараняў правы іншаземных купцоў. Менавіта полацкія купцы прывезлі князю весткі, што Папа

Рымскі прыраўняў паход у Лівонію да паходу ў Палесцінскую зямлю. Полацкая зямля ў аповесці Арлова – арганічная частка Еўропы перыяду Сярэднявечча.

Полацк і Полаччына XIII стагоддзя эстэтычна рэканструяваліся і ў рамане Л. Дайнекі "Меч князя Вячкі". Ад самага пачатку празаік адзначае, што Полаччына была надзвычай цесна звязана з вялікім светам: "Спрадвеку была Дзвіна Полацкім вадзяным ходам у Варажскае мора, на Гоцкі бераг і да паўночных людзей – урманаў. Латгалы, селы і лівы караніліся ўздоўж яе. Яны яшчэ былі язычнікамі і плацілі полацкім князям даніну. Іхнія купцы і старэйшыны ўсё часцей прымалі праваслаўную веру, не забываючы, праўда, і сваіх мясцовых бажкоў і багоў" [5, с. 35]. У залежнасці ад Полацка знаходзіліся два княствы, размешчаныя на землях Латгаліі, – Герцыкскае і Кукейнаскае. Гэта былі розныя па заможнасці і па памкненнях іх правіцеляў маленькія дзяржавы. Кукейнас з'яўляўся не надта багатым княствам, яго правіцель Вячка высока цаніў свабоду і вернасць дадзенаму слову. Малады князь абураўся полацкімі купцамі і палітыкай свайго сюзерэна: "Полацкім купцам і баярам трэба сваё жыта, свой воск везці на Гоцкі бераг і далей. Срэбра ім даражэй за родную веру і зямлю" [5, с. 62]; "Князь Уладзімір не здолеў скрышыць Рыгу і зараз будзе хітрыць і выкручвацца, як ліс" [5, с. 62]. У барацьбе за праўду і волю Вячка ўскладае надзеі на чалавечы розум, прыстойнасць і веру, а таму дзеля стварэння кааліцыі супраць крыжакоў спрабуе звярнуцца да праваслаўных царкоўных іерархаў. У імя вызвалення роднай зямлі ад знешняй навалы ён гатовы даравацць свайму крыўдзіцелю Уладзіміру, які некалі пазбавіў улады бацьку Вячкі Барыса Давыдавіча і саслаў у манастыр яго роднага брата Васілька Барысавіча. Малады князь Кукейноса спрабуе залучыць у якасці саюзніка князя Герцыке Усевалада. Герцыке, паводле пісьменніка, была багатай дзяржавай: "За Селспілсам пачаліся ўладанні герцыкскага князя Усевалада. На герцыкскай зямлі было пяцьдзесят замкаў, мноства ўмацаваных узвышшаў, за сценамі і варотамі якіх людзі хаваліся ў час небяспекі. Найбольш магутнай, багатай і прыгожай між імі была сама Герцыке, шумны, людны горад з дзвюма праваслаўнымі цэрквамі, з грозным княжацкім церамам, з шыкоўнымі сядзібамі баяр і купцоў" [5, с. 55]; "Горад велічна ўзвышаўся на стромым беразе, ззяў чырвоным золатам царкоўных купалоў, шумеў багатым людным торжышчам. Пасад быў апаясаны высокім земляным валам з дубовымі забароламі. На пасадзе шчыльна цясніліся сядзібы рамеснікаў і гандлёвых людзей, весела дыміліся іхнія лазні" [5, с. 60]. Усевалад – васал Полацка, ён падтрымлівае Уладзіміра, сябруе з літоўцамі, мае нават свой сцяг, у адрозненне ад Вячкі: "Сцяг Усевалада і Герцыке – "чырвоны, з белым крыжам" [5, с. 60]. Князю Вячку гэта аўтаномнасць не падабалася, бо ён вёў у бой сваю дружыну пад полацкім сцягам, "белым, з харобрым коннікам, які ўздымае дзясніцу з мячом" [5, с. 60]. У час перамоў Усевалад нагадаў Вячку: "Мы з табой васалы. А васал, калі моцна прыпячэ, можа знайсці сабе новага гаспадара" [5, с. 62]. Вячка адказаў, што ён служыць не Уладзіміру, а Полацку, роднай зямлі. Адносна Усевалада апавядальнік заўважыў: "Ён быў чалавек памяркоўны, асцярожны, жыццё на літоўскім парубежжы навучыла яго разважлівасці і цярплівасці. Слова ў яго не ішло наперадзе мяча" [5, с. 62]. Калі князь Герцыке адразу не даў згоды сумесна выступіць супраць тэўтонаў, Вячка папярэдзіў яго: "Спачатку Кукейнос растопчуць тэўтоны, а потым і да Герцыке іхнія коні дабягуць" [5, с. 63]. Кукейноскі Вячка ў рамане Л. Дайнекі паказаны шчырым патрыётам полацкай зямлі, мудрым правіцелем і мужным воінам. Ён проціпастаўлены па сваіх маральных якасцях полацкаму князю Уладзіміру, надзвычай прагматычнаму чалавеку і правіцелю. У прапанове Вячкі сумесна змагацца з крыжакамі Уладзімір бачыў хітрасць, імкненне сутыкнуць полацкага князя з рыжскім епіскапам Альбертам і Папам Рымскім: "Пойдзеш ваяваць, паслухаўшыся гарлапана Вячкі з Кукейноса, – уладу страціш і галаву" [5, с. 126].

Аповед пра полацкага князя Уладзіміра ў рамане падкрэсліваў своеасаблівасць узаемаадносін уладара і падданых, залежнасць князя ад веча. Уладзімір разумеў, што баяры прагнуць узяць уладу ў свае рукі, таму княскімі саюзнікамі ён абраў рамеснікаў і купцоў. Рамею-астролагу Уладзімір паабяцаў: "Я – князь. У мяне – дружына! Веча разганю, асабліва шкодных баяр жыўцом спалю. Полацк будзе мой!" [5, с. 129]. Князь наракаў, што не ўсё сабе можа дазволіць, хоць ён і ўладар: "Вось ён, лёс князёў полацкіх! На дзядзінцы, каля самай Сафіі, ёсць палаты каменныя, багата прыбраныя. Золата і серабро там, дарагія ўборы і віно заморскае. А ён, князь Уладзімір, павінен сядзець у Бельчыцах і глядзець на горад – свой горад! – праз раку, як глядзіць мокрая курыца праз частакол. І бачыш, і не ўклюнеш. Дзівосы на смецці, дый толькі!" [5, с. 124]. Палітыка полацкага князя Уладзіміра, у адрозненне ад яго васала Вячкі, цалкам грунтавалася на палітычных кампрамісах: "З тэўтонамі трэба зміpыцца. Епіскап Альберт абяцаў плаціць Полацку даніну за ліваў. Хай плоціць. Тэўтоны ўмеюць даніну выкалочваць. Галоўнае – мір з імі. Будзе мір з Рыгай – будзеш ты, князь, на залатасёдлым кані сядзець. Калі епіскап Дыянісій папрасіў князя не дазваляць будаўніцтва "лацінскай" царквы ("Наш крыж не можа суседзіць з крыжам лацінскім" [5, с. 123]), то Уладзімір, кіруючыся жаданнем мець сваімі саюзнікамі іншаземных купцоў, сказаў: "Хай ставяць лаціняне царкву, хай будуюць... Крыж наш ад суседства з лацінскім плесенню не пакрыецца. А вышэй Сафіі тэўтонам храм усё роўна не ўзвесці" [5, с. 125]. Тэўтоны на пэўны час прывабілі Уладзіміра спакусай вечнага міру, аднак пасля Уладзімір разам з Вячкам і старэйшынай эстаў Лембіту сабраўся выступіць супраць Рыгі: "Цёплай зеленатраўнай вясною войска сышлося ў стольным Полацку. Уладзімір, вясёлы і

рашучы, надзеў баявую кальчугу, шлем, абпаясаўся мячом, узбег на багаты княжацкі струг пад крыкі ўсяго войска, і раптам з горла хлынула кроў. Князь упаў і памёр. Войска, якое ўжо ішло, расцягвалася ў чырвона-сінюю вужаку на правым беразе Дзвіны, спынілася, анямела. Вялікае біла загрымела ў Полацку. Усіх тэўтонаў і лацінян, якія былі ў той час у Полацку, забілі" [5, с. 279]. Паход не адбыўся, але Полацк працягваў заставацца асяродкам барацьбы з крыжакамі.

Для насельнікаў беларускіх зямель сярэднявечны Полацк быў сімвалам вольнага горада. Такім, у прыватнасці, у рамане ён бачыўся славутаму Якаву Палачаніну. Купцы ў размовах з нявольнікамі нязменна гаварылі пра Полацк: "Горад вялізны, людзей поўнае мора... А цэрквы якія! А палаты баярскія і княжацкія! Там было б вам лягчэй. Адно толькі полацкае паветра чалавека вольным робіць" [5, с. 141].

Дайнека паказаў Полацк як значны асяродак культуры і пісьменства. Празаік выказаў думку пра існаванне на Полаччыне людзей, якія пісалі на камянях: "Шмат камянёў спрадвеку драмала на гэтай зямлі. Іх вырваў з абдымкаў паўночных гор ледавік, прывалок сюды і, страціўшы сілы, кінуў у дрымучых лясах, на зялёных лугах. Большасць з іх сцёрлася на арэх, на гарох, але некаторыя, веліканы з веліканаў, палохалі людзей сваімі незвычайнымі памерамі. На гэтых камянях полацкія князі, пачынаючы з Рагвалода, загадвалі высякаць свае імёны. Смерды і рамеснікі пісалі на бяросце, князі – на камянях" [5, с. 54]. Полаччына, у трактоўцы Л. Дайнекі, – памежны рэгіён, насельнікам якога былі ўласцівы свабодалюбства, гістырачная памяць.

**Заключэнне.** У вядомай рабоце "Сімволіка Пецярбурга і праблемы семіётыкі горада" Ю.М. Лотман пісаў, што існуюць "дзве асноўныя сферы гарадской семіётыкі: горад як прастора і горад як імя" [6, с. 9]. Горад як замкнутая прастора ізаморфны дзяржаве, горад як імя рэпрэзентуе прастору, надзеленую канкрэтнымі характэрнымі прыкметамі. У творчасці латвійскага і беларускіх пісьменнікаў Полацк і Полаччына найперш прадстаюць як прастора, ізаморфная дзяржаве, што адыгрывала значную ролю ў палітыцы, эканоміцы, культуры свайго часу. Полацк і Полаччына XIII стагоддзя рамантызуюцца, гісторыка-дакументальныя факты канцэптуальна суб'ектывізуюцца празаікамі. Для Яніса Ніедрэ Полацк – асяродак барацьбы з крыжакамі, прызнаны цэнтр культуры; для беларускіх пісьменнікаў Уладзімера Арлова і Леаніда Дайнекі – гэта горад са своеасаблівай архітэктурай, феадальна-рамесніцкай дэмакратыяй, рэлігійнай талерантнасцю жыхароў; уплывовы палітычны, гандлёвы, культурны цэнтр на славянскіх землях.

ЛІТАРАТУРА

1. Ниедре, Я. И ветер гуляет на пепелище…: роман / Я. Ниедре // Всемирная литература. – 1998. – № 3. – С. 125 – 153.
2. Ниедре, Я. И ветер гуляет на пепелище…: роман / Я. Ниедре // Всемирная литература. – 1998. – № 4. – С. 12 – 85.
3. Ниедре, Я. И ветер гуляет на пепелище…: роман / Я. Ниедре // Всемирная литература. – 1998. – № 5. – С. 34 – 74.
4. Арлоў, У. Сны імператара: аповесці, апавяданні, эсэ / У. Арлоў. – Мінск: Маст. літ., 2001. – 383 с.
5. Дайнека, Л. Меч князя Вячкі: раман / Л. Дайнека. – Мінск: Маст. літ., 1987. – 302 с.
6. Лотман, Ю.М. Избранные статьи: в 3 т. / Ю.М. Лотман. – Таллин: Александра, 1992 – 1993. – Т. 1. – 1992. – 479 с.

*Паступіў 21.06.2012*

## POLOTSK AND POLOTSK REGION OF THE XIII$^{th}$ CENTURY IN Ya. NIEDRE'S AND BELARUSIAN WRITERS' WORKS OF THE SECOND HALF OF THE XX$^{TH}$ CENTURY

***V. BOROVKO***

*In the article the artistic image of Polotsk and Polotsk region of the XIII$^{th}$ century in Ya. Niedre's, U. Arlow's and L. Dayneka's works is examined. It is argued that the writers' treatment of the aesthetic reproduction of ancient Polotsk is determined by its significance in European history of the XIII$^{th}$ century and writers' personal interests. It is emphasized that some writers created their own Polotsk text in the second half of the twentieth century. In Ya. Niedre's opinion Polotsk is predominant not only in the sphere of culture but also in its struggle against the Crusaders. U. Arlow and L. Dayneka think that Polotsk is a city with unique architecture, tolerant people and feudal-artisan democracy. They emphasize its importance as a political, military, commercial and cultural centre of the Slavs.*